ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 27 (627) | Субота, 18 кастрычніка 1986 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ЗА ДАПАМОГУ ПРАЦАЎНІКАМ ВЁСКІ

На працягу месяца студэнты нашага універсітэта аказвалі дзейсную дапамогу калгасам і саўгасам Гомельшчыны па ўборцы ўраджаю бульбы, садавіны, ільну, у правядзенні іншых неадкладных сельскагаспадарчых работ. Многія атрады вызначыліся ўдарнай работай, актыўна ўдзельнічалі ў культурна-масавых мерапрыемствах. За гэта яны заслужылі ўдзячнасць працаўнікоў вёскі, удастоены ўзнагарод і прэмій. На кожным факультэце ёсць атрады, якія прывезлі ва універсітэт адзнакі працоўнай доблесці.

**Гісторыка-філалагічны факультэт:** атрад гр. БР-14 (камандзір — асістэнт кафедры беларускай літаратуры В. І. Яцухна) удастоены «Дыплома лепшага калектыву» саўгаса «Чалюшчавічы» Петрыкаўскага раёна. Атрады груп БР-11, Р-11, Г-11 (камандзіры — выкладчыца кафедры англійскай мовы Э. Д. Эдзігер, асістэнт кафедры гісторыі КПСС Ю. Ф. Пархоменка, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі А. М. Бабкоў, асістэнт кафедры рускай літаратуры А. І. Ненадавец), узнагароджаны Ганаровымі граматамі адпаведна саўгасаў «Капаткевічы», імя Ульянава, «Ляскавічы» названага раёна.

**Эканамічны факультэт:** атрады, якія працавалі ў саўгасе «Ленінскі» Жыткавіцкага раёна (камандзір — дацэнт кафедры ТСАЭІ У. С. Давыдаў), калгасе «Усход» і саўгасе «Чырвонаслабодскі» Акцябрскага раёна (камандзіры — дацэнт кафедры ТСАЭІ У. Г. Ракаў, асістэнт кафедры АМАЭІ В. У. Клыга), у калгасе «Юбілейны» і саўгасе «Меркулавічы» Чачэрскага раёна (камандзіры — інжынер НДС Л. М. Кравец, дацэнт кафедры АМАЭІ В. М. Кучмін), узнагароджаны Ганаровымі граматамі названых гаспадарак.

**Матэматычны факультэт:** атрады студэнтаў, якія працавалі ў саўгасе «Сож» і калгасе «Камунар» Чачэрскага раёна (камандзіры — асістэнт кафедры дыфураўненняў П. П. Верасовіч, аспірант кафедры алгебры і геаметрыі А. В. Бузланаў), узнагароджаны Ганаровымі граматамі названых гаспадарак.

**Біялагічны факультэт:** Ганаровай граматай узнагароджан атрад «Біёлаг» (камандзір — асістэнт кафедры хіміі Г. А. Савянок) за ўдарную працу на льнозаводзе «Крыўск» Буда-Кашалёўскага раёна.

## У ПАРТКОМЕ

На чарговым пасяджэнні партыйнага камітэта, якое адбылося на гэтым тыдні ў сераду, разгледжана пытанне аб ходзе будаўніцтва новага вучэбна-лабараторнага корпуса універсітэта. Пры яго абмеркаванні выступілі сакратар парткома М. І. Старавойтаў, прарэктар па вучэбнай рабоце Л. А. Шамяткоў, старшыня прафкома М. Н. Мурашка.

Вызначаны меры па аказанню дапамогі будаўнікам у своечасовым выкананні будаўніча-мантажных работ.

Партком адобрыў ініцыятыву выкладчыкаў і супрацоўнікаў фізічнага, гісторыка-філалагічнага і геалагічнага факультэтаў, якія вырашылі адпрацаваць на ўзвядзенні аб'екта не менш чатырох дзён.

На пасяджэнні парткома разгледжаны кадравыя, а таксама пытанні арганізацыйнай і ідэалагічнай работы.

### УДАСТОЕНЫ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА

## У ЗЕНІЦЕ ТВОРЧАГА ГАРЭННЯ



Напярэдадні 60-х гадоў у Гомелі пад кіраўніцтвам аднаго з відных савецкіх матэматыкаў Сяргея Антонавіча Чуніхіна нараджалася стаўшая хутка сусветна вядомай навуковая школа тэорыі канечных груп. Пад уплывам С. А. Чуніхіна цікавасць Л. А. Шамяткова да матэматыкі ўзяла верх. Самай захапляльнай стала для яго алгебра, тэорыя груп. І, напэўна таму, што менавіта тэорыя груп, узнікшая з неабходнасці знайсці апарат для вывучэння такіх важных заканамернасцей акаляючага нас свету, як заканамернасць сіметрыі, дала яму магчымасць строгага навуковага падыходу да разумення фізікі.

Першыя навуковыя работы Л. А. Шамяткова—надзвычай мэтанакіраваныя — сталі прыкметным укладам у даследаванне так званых сілаўскіх уласцівасцей канечных груп. Ва ўзросце 31 года ён паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю. У ёй, у прыватнасці, даследавалася праблема, рашэнне якой на думку аднаго буйнага зарубежнага матэматыка цяжка было прадбачыць.

Значную частку сваіх навуковых работ Л. А. Шамяткоў прысвяціў развіццю адной з галін сучаснай алгебры — тэорыі фармацый алгебраічных сістэм. Менавіта тут праявіўся яго дар вучонага — адчуць неабходнасць у новых матэматычных паняццях і радам фундаментальных вынікаў выявіць іх ролю, абазначыўшы тым самым выходзячы ад новага паняцця творчы імпульс. Важнасць атрыманых Л. А. Шамятковым навуковых вынікаў садзейнічала таму, што ў 1978 годзе ў выдавецтве «Наука» у серыі «Современная алгебра» выйшла яго манаграфія «Фармацыі канечных груп». Гэта першая ў сусветнай літаратуры спроба сістэматычнага выкладання тэорыі фармацый канечных груп.

Як і яго былы настаўнік С. А. Чуніхін, Леанід Аляксандравіч добра разумее, што навука і далучэнне да яе маладых людзей — два бакі адной і той жа дзейнасці — дзейнасці вучонага. Падрыхтаваныя пад яго навуковым кіраўніцтвам 15 кандыдатаў навук працуюць у ВНУ нашай рэспублікі і Расійскай Федэрацыі.

Калі пабываеш на пасяджэннях кіруемага ім навуковага семінара, міжволі звернеш увагу на здольнасць Леаніда Аляксандравіча захапіцца тым, што зрабіў яго вучань, ці больш таго, выказаць захапленне. Напрыклад, пасля аднаго з нядаўніх дакладаў ён усклікнуў: «Дык гэта ж цэлая паэма!» Такія адносіны да матэматычнай творчасці сваіх вучняў несумненна надаюць ім новае натхненне.

У сваёй педагагічнай дзейнасці ў якасці лектара Леанід Аляксандравіч выступае страсным прапагандыстам дыялогу са слухачамі — такога дыялогу, які захапляў бы слухачоў і даваў ім шчаслівае перажыванне пазнання.

Выдатны матэматык сучаснасці Герой Сацыялістычнай Працы акадэмік П. С. Аляксандраў адзначаў, што «ўсякая выхаваўчая работа павінна пачынацца з павагі да таго, каго вы збіраецеся выхоўваць». Гэтыя выдатныя словы прыходзяць на памяць, калі бачыш Леаніда Аляксандравіча ў час яго тлумачэнняў студэнту-дыпломніку або калі па просьбе студэнтаў ён падымаецца на сцэну з залы і выконвае на фартэпіяна эцюд Шапэна, калі вядзе гутарку ў студэнцкім інтэрнаце або выступае ў факультэцкім літаратурным клубе «Градыент» з лекцыяй «Матэматыка і музыка».

Доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, член-карэспандэнт АН БССР, член гарадскога камітэта партыі, народны дэпутат, прарэктар універсітэта... Усё гэта не проста ступені, званні і пасады. Гэта вехі вялікага і цяжкага шляху разумення навуковай ісціны, станаўлення асобы вучонага і педагога.

Высокая і заслужаная ўзнагарода Радзімы прыйшла да Леаніда Аляксандравіча Шамяткова ў зеніце яго творчага гарэння. У любой справе — вялікай і малой — ён ніколі не ведае спакою, без канца спрабуе розныя падыходы да рашэння навуковых і вытворчых задач, пакуль, нарэшце, не знаходзіць патрэбнага рашэння. Адным словам, ён — чалавек сённяшняга дня, які жыве па ленінскаму прынцыпу «глядзець наперад, у бок прагрэсу».

Л. ПАЛЯКОЎ,
сакратар партбюро матэматычнага факультэта, дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі.

## АТРЫМАЛІ ЎЗНАГАРОДЫ

За ўдзел у экспазіцыі на ВДНГ БССР, прысвечанай 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, група выкладчыкаў, студэнтаў, супрацоўнікаў універсітэта ўзнагароджана дыпломамі, грашовымі прэміямі.

Дыпломаў II ступені ўдастоены загадчык кафедры беларускай мовы прафесар У. В. Анічэнка за стварэнне слоўніка Ф. Скарыны ў 2-х тамах; старшы навуковы супрацоўнік НДЛ «Сінтэз» В. А. Яцкевіч — за распрацоўку прынцыпа пабудовы камплекта пярвічных пераўтваральнікаў інфармацыі; электраакустычнага пераўтваральніка.

Дыпломам III ступені і грашовай прэміяй узнагароджаны загадчык кафедры тэарэтычных асноў фізічнага выхавання к. п. н. У. А. Баркоў за распрацоўку і выраб трэнажора для трэніроўкі стралка з лука, укаранёнага ў вучэбны працэс.

Дыплома III ступені ўдастоены загадчык кафедры радыёфізікі дацэнт І. Ф. Дабравольскі, загадчык кафедры ГА і медпадрыхтоўкі В. П. Дзядзічкін, выпускнік факультэта фізічнага выхавання В. Дубадзелаў. Імі былі прадстаўлены на выстаўцы адпаведна тэхнічнае абгрунтаванне магчымасці пабудовы і эфектыўнага выкарыстання камплекта пярвічных пераўтваральнікаў інфармацыі, прыбор для фізіялагічнай ацэнкі працаздольнасці чалавека і трэнажор для трэніроўкі стралка з лука.

Яшчэ адзін экспанат загадчыка кафедры ТАФВ У. А. Баркова — трэнажор «Увага» — дэманстраваўся на выстаўцы «Навука, тэхніка і эканоміка Беларускай ССР», якая праходзіла вясной бягучага года ў сталіцы Польскай Народнай Рэспублікі. Ён выклікаў вялікую цікавасць у школьнікаў, навучэнцаў прафтэхвучылішчаў, творчай моладзі ПНР. Дырэкцыя выстаўкі выказала падзяку яго аўтару за цікавы экспанат.

Н. ПАЛЯКОВА,
інжынер службы тэхнічнай інфармацыі НДС ГДУ.

## ПАВЕДАМЛЕННЕ

**24-га кастрычніка ў аўдыторыі 3—2 галоўнага корпуса адбудзецца VIII агульнауніверсітэцкая справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя.**

**ПАРАДАК ДНЯ:**

1. Справаздача прафкома.
2. Справаздача рэўкамісіі.
3. Выбары прафкома.
4. Выбары рэвізійнай камісіі.
5. Выбары дэлегатаў на абласную справаздачна-выбарную прафсаюзную канферэнцыю.

Пачатак канферэнцыі ў 11 гадзін. Рэгістрацыя дэлегатаў з 10.30.

*Да справаздач і выбараў у таварыстве «Веды»*

# ЛЕКТАРСКАМУ СЛОВУ—СІЛУ

Вясной наступнага года адбудуцца чарговыя IX Усесаюзны і X рэспубліканскі з'езды таварыстваў «Веды». У сувязі з заканчэннем паўнамоцтваў кіруючых органаў пярвічных (факультэцкіх і кафедральных — усяго 16) і універсітэцкай арганізацыі таварыства «Веды» у гэтых структурных звеннях пачалася справаздачна-выбарная кампанія. Вызначальным у яе змесце павінен стаць усебаковы аналіз дзейнасці кожнага лектара і ўсяго лектарскага калектыву ГДУ па прапагандзе рашэнняў і матэрыялаў XXVII з'езда КПСС у непарыўным адзінстве з выкананнем патрабаванняў па перабудове лекцыйнай прапаганды, удасканальванню кіравання лекцыйным працэсам.

Падрыхтоўка і правядзенне справаздач і выбараў праходзяць у адказны перыяд развіцця савецкага грамадства, калі пад уздзеяннем гістарычных, наватарскіх рашэнняў XXVII з'езда КПСС паўсюдна ўстанаўліваецца атмасфера патрабавальнасці і праўдзівасці. Гэта павінна праявіцца і на ўзроўні крытычнага разгляду кожнага лектара, кожнага лектарскага калектыву ў рэалізацыі генеральнай лініі партыі на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, прывесці іх да выпрацоўкі і прыняцця рашэнняў, нацэленых на далейшую актывізацыю іменна сістэмнай прапагандысцкай работы. Аб гэтым ішла размова на семінары старшынь пярвічных арганізацый таварыства «Веды» у парткоме універсітэта. Старшыня праўлення таварыства «Веды» ГДУ І. В. Нямкевіч азнаёміў прысутных з рэкамендацыямі рэспубліканскага таварыства па падрыхтоўцы і правядзенню справаздачна-выбарнай кампаніі. Было прынята рашэнне правесці яе ў пярвічных арганізацыях у кастрычніку—лістападзе, справаздачнаа-выбарную канферэнцыю ГДУ — 5-га снежня 1986 г.

На справаздачна-выбарных сходах пярвічных арганізацый эканомфака (старшыня Т. Д. Трацэўская), гістфіла (У. С. Дайнэка), матфака (М. І. Жадан), фізічнага факультэта (Т. П. Жалонкіна), біяфака (Л. М. Цярлюкевіч), геафака (М. І. Аўтушка), факультэта фізвыхавання (А. Ф. Семікоп), а таксама кафедр палітэканоміі, філасофіі, гісторыі КПСС, педагогікі і псіхалогіі, фізвыхавання, замежных моў (старшыні адпаведна В. П. Галееў, А. А. Фяськоў, В. М. Лебедзева, Ф. У. Кадол, В. А. Каляда, Н. П. Марозава), навукова-даследчай лабараторыі сістэмнага праграміравання будуць заслуханы і зацверджаны справаздачы бюро пярвічных арганізацый, выбраны іх новы састаў і дэлегаты на канферэнцыі універсітэцкай і раённай арганізацый.

Для паўсядзённага кіраўніцтва работай пярвічнай арганізацыі агульныя сходы выбіраюць бюро тэрмінам на 2—3 гады. У састаў бюро ўваходзяць старшыня, яго намеснік, сакратар і члены. Колькасны састаў бюро ўстанаўліваецца сходам. У пярвічных арганізацыях кафедр навуковага камунізму, грамадзянскай абароны і медпадрыхтоўкі, якія аб'ядноўваюць да 10 членаў таварыства, будуць выбраны старшыня і сакратар.

У адпаведнасці з рашэннем праўлення таварыства «Веды» ГДУ кожная пярвічная арганізацыя выбірае дэлегатаў на універсітэцкую канферэнцыю. Норма прадстаўніцтва — адзін дэлегат ад 6 членаў, на канферэнцыю арганізацыі Цэнтральнага раёна — адзін дэлегат ад 10 членаў таварыства. Старшыні пярвічных арганізацый абавязаны прадставіць матэрыялы па справаздачах і выбарах у праўленне арганізацыі да 20 лістапада 1986 г.

Сакратарам партбюро факультэтаў, партгрупоргам кафедр, старшыням і членам бюро пярвічных арганізацый прадстаіць вялікая работа па падрыхтоўцы і правядзенню справаздач і выбараў у духу патрабавальнасці, дзелавога і прынцыповага падыходу, крытычнай ацэнкі працы кожнага лектара і лектарскага калектыву.

Праўленне таварыства «Веды» ГДУ ўпэўнена, што мабілізуючае ўздзеянне на ўдзельнікаў справаздачна-выбарных сходаў і дэлегатаў канферэнцыі акажа падрыхтоўка дастойнай сустрэчы 70-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, падвядзенне вынікаў выканання планаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця краіны ў першым годзе XII пяцігодкі. Гэтым самым справаздачам і выбарам будзе забяспечаны высокі арганізацыйны і палітычны ўзровень.

**В. СТАРАКОЖАВА,**
**адказны сакратар таварыства «Веды» ГДУ, член парткома.**

*На шляху перабудовы*

# МЕТРАЛАГІЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ВУЧЭБНАГА ПРАЦЭСУ

Тэрмін «Метралагічнае забеспячэнне вучэбнага працэсу» усё часцей сустракаецца ў матэрыялах, прысвечаных вышэйшай школе. Аднак змест гэтага віду вузаўскай дзейнасці да гэтага часу абмяркоўваўся недастаткова.

Пад метралагічным забеспячэннем (МЗ) разумеецца «устанаўленне і прымяненне навуковых і арганізацыйных асноў тэхнічных сродкаў, правілаў і норм, неабходных для дасягнення адзінства і патрабуемай дакладнасці вымярэнняў». Аналіз гэтага стандарта паказвае, што, пры ўсёй яго агульнасці, выкладзеныя ў ім задачы і змест, МЗ характэрны для прадпрыемстваў і арганізацый навуковай і вытворчай сфер і не ахоплівае многіх бакоў вузаўскай педагагічнай дзейнасці, звязанай з правядзеннем вучэбнага працэсу. Як нам здаецца, акрамя задачы забеспячэння адзінства і дакладнасці вымярэнняў, якія праводзяцца ў ходзе вучэбнага працэсу, ва універсітэце павінен прад'яўляцца рад патрабаванняў да метралагічнага ўзроўню кампанентаў вучэбнага працэсу — лекцыйных курсаў, вучэбна-даследчай работы студэнтаў, кантрольных заданняў, курсавых, дыпломных работ і інш. Такія патрабаванні павінны распаўсюджвацца на ўсе віды вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратуры па агульных і спецыяльных дысцыплінах.

Захаванне метралагічных патрабаванняў і правілаў выкладчыкамі і студэнтамі на працягу ўсяго перыяду навучання складае аснову бесперапыннай метралагічнай падрыхтоўкі, вымяральнай тэхнікі, неабходных у канчатковым выніку, для дасягнення стабільных паказчыкаў якасці, надзейнасці і высокага тэхнічнаага ўзроўню выпускаемай прадукцыі, актыўнага ўдзеяння на якасць прадукцыі шляхам сістэматычнага ўдасканалвання стандартаў і метралагічнага забеспячэння.

Улічваючы гэта ў метадычнай літаратуры ўжо сфармулявана вызначэнне метралагічнага забеспячэння вучэбнага працэсу як «устанаўленне і прымяненне ў вучэбным працэсе навуковых арганізацыйных асноў тэхнічных сродкаў, правілаў і норм, неабходных для дасягнення патрабуемага ўзроўню метралагічнай падрыхтоўкі маладых спецыялістаў».

Такім чынам, пашырэнне сферы дзейнасці метралагічнай службы універсітэта змяняе яе структуру (у яе ўводзяцца элементы (падраздзяленні), якія забяспечваюць арганізацыю і кантроль метралагічнага ўзроўню ўсіх кампанентаў вучэбнага працэсу.

Канкрэтны змест і дадатковыя напрамкі дзейнасці, якія выцякаюць з неабходнасці метралагічнага забеспячэння вучэбнага працэсу, павінны ўключаць:

— распрацоўку структуры і арганізацыі метралагічнай службы універсітэта з ахопам ёй сферы вучэбнага працэсу;

— устанаўленне асноўных аб'ектаў метралагічнага забеспячэння і стандартызацыі ў вучэбным працэсе;

— распрацоўку палажэння, якое рэгламентуе асноўныя мэты, правілы і нормы метралагічнага забеспячэння вучэбнага працэсу (магчыма, на ўзроўні галіновага стандарта);

— распрацоўку мерапрыемстваў па арганізацыі метралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў на працягу ўсяго перыяду навучання;

— распрацоўку комплексу нарматыўна-тэхнічнай і арганізацыйна-метадычнай дакументацыі па пытаннях метралагічнага забеспячэння канкрэтных відаў вучэбнага працэсу;

— правядзенне абавязковай метралагічнай экспертызы ўсёй унутрывузаўскай вучэбна-метадычнай дакументацыі, ВДРС, курсавых і дыпломных работ;

— правядзенне мерапрыемстваў па ўдасканаленню падрыхтоўкі прафесарска-выкладчыцкага саставу і вучэбна-дапаможнага персаналу кафедр у галіне метралогіі і стандартызацыі;

— забеспячэнне кафедр ГДУ асноўнымі і спецыяльнымі (па профілю кафедры) стандартамі ГСІ, метадычнымі матэрыяламі і інструкцыямі па пытаннях метралогіі і стандартызацыі.

Гэтыя прынцыпы і напрамкі павінны з'яўляцца асноўнай агульнауніверсітэцкай сістэмай упраўлення якасцю падрыхтоўкі спецыялістаў падсістэмы «Метралагічнае забеспячэнне вучэбнага працэсу». Пры гэтым, улічваючы мэты і задачы метралагічнага забеспячэння вучэбнага працэсу, у метралагічную службу універсітэта павінны ўключацца вучэбны аддзел, кафедра фізічнай метралогіі і шэраг іншых кафедр ГДУ.

Укараненне ўказанай падсістэмы з'яўляецца асабліва важнай у цяперашні час, калі ідзе перабудова вышэйшай школы.

**М. АЛЯШКЕВІЧ,**
**загадчык кафедры фізічнай метралогіі.**

*Мы—інтэрнацыяналісты*

# СВЯТА ГВІНЕЙСКІХ СТУДЭНТАЎ



НЯСПЫННА бяжыць час... Здаецца, зусім нядаўна сустракалі мы першых замежных студэнтаў, вырашалі разам з імі пытанні нашага паўсядзённага жыцця, радаваліся іх першым поспехам у вучобе. А поспехі сапраўды нядрэнныя — першы курс студэнты-матэматыкі з Беніна і Маўрыкія скончылі з адзнакамі «добра» і «выдатна».

З гэтага навучальнага года інтэрнацыянальная сям'я нашага універсітэта папоўнілася прадстаўнікамі Гвінейскай Рэспублікі, Экватарыяльнай Гвінеі, Сірыі, Шры-Ланка, Мадагаскара, Малаві і Народнай Рэспублікі Кампучы. Акрамя матэматыкаў, зараз у нас займаюцца філолагі па спецыяльнасці «Руская мова і літаратура».

У сакавіку гэтага года мы ўпершыню правялі вечар інтэрнацыянальнай дружбы, прысвечаны дню незалежнасці Маўрыкія. А зусім нядаўна савецкія і замежныя студэнты зноў сабраліся разам. 2 кастрычніка — дзень абвяшчэння незалежнасці Гвінейскай Рэспублікі, з гэтай афрыканскай краіны сёлета да нас **прыехалі 8 студэнтаў.** Усе яны пры актыўнай падтрымцы сваіх савецкіх і замежных сяброў старанна рыхтаваліся да свята. І вось у святочна ўпрыгожаную залу студэнцкага кафэ ўваходзяць гвінейскія студэнты, якіх сардэчна, з хлебам-соллю сустрэлі студэнты матэматычнага факультэта. З віншаваннем да «віноўнікаў» урачыстасці звярнуўся дэкан па рабоце з замежнымі навучэнцамі У. А. Сізоненка, а затым ім былі ўручаны сувеніры. З асаблівай цікавасцю выслухалі прысутныя выступленне выкладчыка матэматычнага факультэта Ю. А. Кашына, які нядаўна вярнуўся з Гвінейскай Рэспублікі, дзе ён працаваў разам з іншымі савецкімі спецыялістамі. Гвінейскіх студэнтаў шчыра віталі таксама старшыня студсавета інтэрната № 2 Г. Базылева і камендант гэтага інтэрната А. І. Саўчанка.

**У сваім выступленні** староста гвінейскіх студэнтаў Лай Камара расказаў прысутным аб сваёй радзіме, аб тым, які доўгі і цяжкі шлях прайшла Гвінейская Рэспубліка, каб вызваліцца ад каланіяльнага прыгнёту. Ад імя сваіх землякоў і ўсяго гвінейскага народа Лай Камара выказаў глыбокую ўдзячнасць савецкай дзяржаве за магчымасць набываць веды па абранай спецыяльнасці.

З асаблівым пачуццём гвінейскія студэнты выканалі дзяржаўны гімн сваёй радзімы. Нікога не пакінулі абыякавым песні і танцы ў выкананні Керфала Камара, Дзіало Мартэна Малумба, Макана Кондэ і іншых гвінейскіх студэнтаў. Раланд Кундэ (Бенін), Джуці Анджай (Маўрыкій), Раджаб Алі (Сірыя), Петэр Марама (Малаві) вітаючы сваіх сяброў з Гвінейскай Рэспублікай, пажадалі ім моцнага здароўя, шчасця, поспехаў у вучобе. Доўга не змаўкалі апладысменты пасля выступлення кампучыйскіх студэнтаў — Рат Тхаўро і Чхум Ван Чхан выканалі гарэзлівы і лірычны танец «Хустка кахання».



Акампаніраваў ім на народным інструменце Кхім Сарын.

Многа шчырых, цёплых слоў было сказана ў той вечар, але часцей за ўсё можна было пачуць пажаданні міру, пленнай стваральнай працы і вучобы, з якімі звярталіся адзін да аднаго прадстаўнікі розных краін.

**У. КОВАЛЬ,**
**нам. дэкана па рабоце з замежнымі навучэнцамі.**

**На здымках: 1. Гвінейскія студэнты выконваюць гімн сваёй Радзімы. 2. Выступае студэнт гісторыка-філалагічнага факультэта з рэспублікі Малаві Петэр Марама.**

Фота Н. Кір'янавай і Л. Акінчыц

*...вышэйшай школы*

# ШТО НА ТВАІМ ДЫСПЛЕІ?

Усім стала ясна: скончыўся час эканамістаў-выканаўцаў, Грамадству патрэбны эканамісты — арганізатары вытворчасці.

Успамінаю той час, калі нам, групе студэнтаў эканамічнага факультэта, даверылі ўдзельнічаць у распрацоўцы эканамічнай задачы, ад вынікаў рашэння якой залежала вельмі многае. Пошукі аптымальнага варыянту размеркавання рабочых месц на Мазырскай трыкатажнай фабрыцы — такая была пастаўлена мэта. Праграма ўключала цэлы комплекс даследаванняў. Памятаю сваю радасць, калі нам паведамілі, што прапанаваная кафедрай сістэма арганізацыі працы дала значны эканамічны эфект.

А спецыяльнасць наша з тых, якія значацца ў авангардзе эканамічнага пошуку — арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі.

Тыя, што будуць пасля заканчэння універсітэта працаваць з электронна-вылічальнымі машынамі, зараз спасцігаюць асновы сваёй прафесіі з дапамогай аўтаматызаваных абучаючых сістэм.

Выкарыстанне аўтаматызаваных абучаючых сістэм і дзелавых гульняў у вучэбным працэсе, на наш погляд, дасць якасна новы падыход у справе падрыхтоўкі эканамістаў.

Чым запомніўся мне той першы, мазырскі эксперымент? Самастойнасцю, я б назвала, самазначнасцю работы эканамістаў, якія не канстатавалі існуючае становішча, а мадэліравалі і сцвярджалі такую арганізацыю вытворчасці, якая б была найбольш эфектыўнай. Навыкі самастойнасці ў многім фарміруе і выкарыстанне мікра- і мініЭВМ. Возьмем такую яго форму, як дзелавыя гульні.

Дзелавыя гульні —гэта своеасаблівае мадэліраванне працэсаў і механізмаў кіравання вытворчасцю. Іх навучальны эфект забяспечваецца перш за ўсё тым, што студэнт шукае рашэнне ў змадэліраванай сітуацыі. У мадэліраванні яе актыўна выкарыстоўваецца ЭВМ. Тут ёсць прастор для фантазіі, самастойнасць выбару. А дзякуючы таму, што вылічэнні машына зробіць хутка, студэнт бачыць на дысплеі і канкрэтныя вынікі сваіх дзеянняў.

Такім чынам ужо не абстрактнае «уявім сабе эканамічную сітуацыю...», а блізка да рэальнай эканамічная сітуацыя мадэліруецца машынай, і студэнт становіцца актыўным удзельнікам прапанаванай мадэлі.

Пачынаючы з верасня 1985 года група студэнтаў нашай спецыяльнасці падрыхтавала і рэалізавала сцэнарыі дыялога з машынай па такіх тэмах курса «Тэорыя гульняў і даследаванне аперацый», як «Мадэлі кіравання запасамі», «Метады рашэння гульнявых задач» і інш. Студэнтка Т. Гільяшэнка напісала праграму дзелавой гульні для мікраЭВМ «Заказ на матэрыялы». Яна імітуе дзейнасць падраздзялення, якое забяспечвае планаванне і арганізацыю матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

Створаныя на базе мікраЭВМ «Электроніка-60» і СМ-4 абучаюча-кантраліруючыя дыялагавыя праграмы дазваляюць праверыць засваенне тэарэтычнага матэрыялу ўсеабдымна: наколькі глыбока вывучаны асноўныя формулы разліку, ці здольны студэнт да самастойнага мыслення, і самае галоўнае — ці справіцца ён з актыўнай роляй на вытворчасці.

У далейшым мы разлічваем расшырыць тэматыку работ па стварэнню навучальных сістэм і дзелавых гульняў. У нашы планы ўваходзіць і выкарыстанне дысплейнага класа з мініЭВМ СМ-4 і ЛС ЭВМ. Гэта дазволіць індывідуалізаваць работу, даць кожнаму студэнту магчымасць застацца сам-насам з машынай.

Вось ужо год, як па ініцыятыве камітэта камсамола і савета маладых вучоных на факультэце створаны педагагічны атрад, у складзе якога — студэнты спецыяльнасці «Арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі». Дапамагчы школьнікам у больш глыбокім авалодванні курсам «Асновы інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі», вывучэнні канкрэтных моў праграміравання, знаёмстве з мікра- і мініЭВМ — такую задачу ставіць перад сабой педатрад. Аб'ектам дзейнасці яго з'яўляецца вучэбна-вытворчы камбінат № 1 г. Гомеля.

Гэтая работа дапаможа школе. Карысна яна і самім студэнтам, таму што дасць ім магчымасць глыбей авалодаць спецыяльнасцю па прынцыпу: вучу другога — вучуся сам.

Век ЭВМ непазбежна прыўнёс у наша жыццё такое паняцце, як «камп'ютэрнае мысленне». Некаторыя лічаць яго антонімам слова творчасць. Глыбока памылковае меркаванне. Нашай мэтай з'яўляецца якраз такое «камп'ютэрнае мысленне» студэнтаў-эканамістаў, якое б у спалучэнні з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй давала неабсяжны прастор для творчасці, мадэліравання.

Што паказвае дысплей студэнту сёння, тое ён будзе пераўтвараць у жыццё заўтра.

**В. КЛЫГА,**
**асістэнт кафедры «Арганізацыя механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі» ГДУ, кандыдат эканамічных навук.**

*Правяраюць народныя дазорныя* •

# ЧАМУ НЕ ПРАЦУЮЦЬ БУФЕТЫ?

**ЗАДАЮЦЬ ПЫТАННЕ СТУДЭНТЫ І СУПРАЦОЎНІКІ УНІВЕРСІТЭТА**

З кожнай праверкай членамі сектара быту галаўной групы народнага кантролю работы кропак грамадскага харчавання універсітэта з'яўляюцца новыя акты, якія адлюстроўваюць становішча спраў у сталовых №№ 40, 86, буфетах вучэбных карпусоў і студэнцкіх інтэрнатаў. Стос гэтых актаў — даволі ўнушальны, а сутнасць іх застаецца нязменнай на працягу некалькіх гадоў: буфеты працуюць нерэгулярна або наогул закрыты, асартымент прапануемых страў вельмі бедны, нізкая іх якасць, крайне нездавальнае наведвальнікаў санітарны стан кропак грамадскага харчавання, не рэалізуюцца ў продаж некаторыя прадукты павышанага попыту ў сталовай № 40. Пералік адмоўных момантаў у рабоце буфетаў і сталовых можна было б працягваць. Неадназначна гаварылася аб іх на розных узроўнях, на старонках універсітэцкай шматтыражкі, выказваліся пэўныя прапановы па паляпшэнню арганізацыі грамадскага харчавання. А справы ў лепшы бок не мяняюцца. Наадварот, становяцца горшымі. Гэта пацвердзіла нядаўняя праверка народных кантралёраў.

Ужо другі тыдзень ідуць заняткі ва універсітэце. І ні ў адным вучэбным корпусе студэнты, супрацоўнікі не могуць прыйсці ў буфет, каб выпіць гарачага чаю ў час перапынку, паабедаць. Памяшканне буфета ў галоўным корпусе своечасова не адрамантавана, таму па санітарных нормах адкрыць яго нельга. І цяпер яго буфетчыца працуе ...кастэлянкай у сталовай № 40. Вісіць замок на дзвярах буфета і ў першым корпусе. Яго буфетчыца Прышчэпава адпраўлена на курсы павышэння кваліфікацыі, якія закончацца толькі 15 лістапада. Увесь верасень не мелі магчымасці паесці на перапынках каля 600 студэнтаў-завочнікаў, у якіх заняткі пачыналіся ў 8.20 і заканчваліся ў 17.30. А калі спытаць студэнтаў матэматычнага і фізічнага факультэтаў, якія займаюцца ў корпусе № 2, калі яны ў апошні раз мелі магчымасць паесці ў буфеце, наўрад ці яны ўспомняць — ужо на працягу некалькіх гадоў ён не працуе.

Не ўсе жыхары студэнцкіх інтэрнатаў могуць прыйсці на заняткі паснедаўшы, бо толькі нядаўна ў першым і чацвёртым інтэрнатах адкрыліся буфеты.

Калі раней у час перапынкаў паміж лекцыямі студэнты маглі купіць булачкі, іншыя кандытарскія вырабы ў так званай «кармушцы», дык цяпер і гэтага выноснага продажу не стала.

На такое дрэннае становішча спраў з арганізацыяй грамадскага харчавання студэнтаў і супрацоўнікаў зноў даводзіцца чуць дзесяткі адгаворак, спасылак на аб'ектыўныя прычыны і цяжкасці з боку работнікаў АГЧ, трэста сталовых, рэстаранаў і кафэ, загадчыка сталовай № 40 А. Ф. Ляньковай. Іх абяцанні ўхіліць усе недахопы застаюцца пустымі словамі, і ўжо не прымаюцца на веру. Настаў час спытаць з іх больш строга за безадказнасць і валакіту. Бо, як кажуць, абяцаннямі сыты не будзеш.

**Л. БАГАМАЗ,**
**член сектара быту галаўной групы народнага кантролю.**

НОВЫЯ КНІГІ

# АБ ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ

У новай рэдакцыі Праграмы КПСС, прынятай XXVII з'ездам партыі, гаворыцца: «Партыя і далей будзе нястомна працаваць над тым, каб у савецкім чалавеку любоў да радзімы Кастрычніка, да зямлі, дзе нарадзіўся і вырас, гордасць за гістарычныя здзяйсненні першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы спалучаліся з пралетарскім, сацыялістычным інтэрнацыяналізмам». Патрыятычнае выхаванне ўсяго савецкага народа і асабліва падрастаючага пакалення і надалей будзе адной з важнейшых задач ідэйна-выхаваўчай работы партыі. У гэтай справе ўжо накоплены значны практычны вопыт, у тым ліку і ў мясцовых партыйных арганізацыях.

Калектыўная манаграфія групы партыйных, савецкіх работнікаў і вучоных-грамадазнаўцаў ВНУ Гомеля «Патрыятычнае выхаванне працоўных» (рэдактар — кандыдат гістарычных навук В. К. Ракашэвіч) якраз і прысвечана даследаванню вопыту Гомельскай абласной партыйнай арганізацыі па патрыятычнаму выхаванню працоўных, павышэнню яе эфектыўнасці.

У манаграфіі даецца тэарэтычнае абагульненне асноўных праблем патрыятычнага выхавання (аўтары раздзелаў — кандыдаты гістарычных навук У. І. Качаткоў, А. П. Смоліна, Г. С. Еўдакіменка і інш.). Але галоўнае ў ёй — аналіз практычнага вопыту. Аўтары шырока абапіраюцца на матэрыялы канкрэтных сацыялагічных даследаванняў, якія праводзіліся грамадскім інстытутам сацыялагічных даследаванняў пры Гомельскім абкоме і гаркоме КПБ на прадпрыемствах г. Гомеля і вобласці.

Як важную састаўную частку ўсёй ідэалагічнай работы, разглядае патрыятычнае выхаванне сакратар абкома КПБ С. П. Бабыр. Абласная партыйная арганізацыя пастаянна трымае ў цэнтры сваёй увагі гэтую важную справу. Найбольшага поспеху дабіліся ў Светлагорску, дзе гарком КПБ і пярвічныя партыйныя арганізацыі вядуць работу сістэматычна і планамерна.

У патрыятычным выхаванні ўзрастае роля прафсаюзаў, камсамола, ДТСААФ, ваенкаматаў, органаў народнай асветы, аховы здароўя, культуры. Асабліва важная роля органаў масавай інфармацыі — абласной і мясцовых газет. Гомельскае тэлебачанне выпускае тэлеальманах «Подзвіг». Ствараюцца помнікі, мемарыяльныя знакі.

У цэлым можна сказаць, што метады партыйнага кіраўніцтва патрыятычным выхаваннем у вобласці, не з'яўляючыся унікальнымі ў параўнанні з агульнапрынятымі, вызначаюцца перш за ўсё наяўнасцю сістэмы, дакладнага плана, пастаяннасці, паўсядзённай увагі да гэтай важнай справы.

Патрыятычнае выхаванне ў значнай ступені залежыць ад узроўню лекцыйнай прапаганды. Яна павінна весціся, адзначае кіраўнік лектарскай групы абкома КПБ А. С. Успенскі, яркім, даходлівым словам. Вобласць багата рэвалюцыйнымі, баявымі і працоўнымі традыцыямі. Жыццё С. С. Камісарава, І. І. Ланге, Н. С. Білецкага, В. З. Харужай, М. Дворнікава, легендарнага дзеда Талаша, герояў Вялікай Айчыннай вайны служыць прыкладам моладзі.

У адпаведнасці з рашэннямі XXVII з'езда КПСС, чэрвеньскага (1983 г.) і красавіцкага (1985 г.) Пленумаў ЦК КПСС узмоцнена ўвага да ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню і дзейснасці лекцыйнай прапаганды.

Патрыятычнае выхаванне, як указваецца ў рэцэнзуемай кнізе, пастаянна знаходзіцца ў полі зроку ўстаноў культуры вобласці. Яны кіруюцца пастановай ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню выкарыстання клубных устаноў і спартыўных збудаванняў», прынятай у чэрвені 1985 года. Гэтыя ўстановы — бібліятэкі, клубы, палацы і Дамы культуры — у разнастайных формах прапагандуюць і праслаўляюць подзвігі абаронцаў Радзімы. Працуюць народныя універсітэты культуры, маральнага, ваенна-патрыятычнага выхавання, праводзяцца тэматычныя вечары, даюцца спектаклі, канцэрты і г. д.

Асноўным напрамкам з'яўляецца патрыятычнае выхаванне ў працоўных калектывах. У спецыяльнай главе манаграфіі (аўтары кандыдаты гістарычных навук А. П. Мяшчэрскі і Э. М. Энцін) на аснове даных сацыялагічных даследаванняў, праведзеных на 15 буйнейшых прамысловых прадпрыемствах вобласці, прааналізаваны як пэўныя дасягненні ў гэтым напрамку, так і наяўныя недахопы.

У кнізе разглядаецца работа па патрыятычнаму выхаванню сельскіх працаўнікоў (кандыдат філасофскіх навук Г. І. Харошка, кандыдат гістарычных навук В. І. Саковіч).

Прадметам спецыяльнага даследавання з'явіліся праблемы ўзаемасувязі патрыятычнага выхавання і асобы. Працэс фарміравання актыўнай жыццёвай пазіцыі савецкага чалавека ў ходзе патрыятычнага выхавання прааналізаваны загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі абкома КПБ, кандыдатам гістарычных навук А. М. Іванісавым і прафесарам, доктарам філасофскіх навук У. М. Калмыковым.

Разглядаюцца ў рэцэнзуемай кнізе таксама пытанні ўплыву творчай свядомай працы на выхаванне якасцей патрыёта, пачуцця патрыятычнага і інтэрнацыянальнага абавязку ў ходзе міжгаспадарчых эканамічных сувязей, ва ўмовах шматнацыянальных калектываў, роля традыцый у патрыятычным выхаванні (аўтары раздзелаў кандыдаты гістарычных навук Г. С. Еўдакіменка, А. А. Рубан і інш.).

Вялікую ўвагу патрыятычнаму выхаванню ўдзяляюць грамадскія арганізацыі. Кандыдаты гістарычных навук Э. А. Чартко, Т. І. Язэпава, І. Ф. Эсмантовіч паказваюць гэта на прыкладзе прафсаюзнай арганізацыі Гомельскага ўпраўлення нафтаправода «Дружба», камсамольскай арганізацыі завода «Гомсельмаш».

Параўнальна невялікая кніга ўвабрала ў сябе вялікі і важны матэрыял. Не ўсё ў ёй, зразумела, раўназначна. Некаторыя бакі разглядаемай праблемы мелі патрэбу ў самастойнай главе. Напрыклад, дзейнасць таварыства «Веды», народных універсітэтаў аховы помнікаў гісторыі і культуры і ў цэлым адпаведнага таварыства.

У прынцыпе няправільна, як робяць асобныя літаратары, зводзіць паняцце патрыятызму толькі да мінулага. Або наадварот — недаацэньваць гэта мінулае. На тэрыторыі нашай вобласці адбываліся важныя гістарычныя падзеі — па Дняпру і яго прытоках пралягаў шлях «з варагаў у грэкі», пад Лоевам прайшла буйная бітва часоў барацьбы ўкраінскага і беларускага народаў за незалежнасць пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага; на поўначы вобласці ішлі баі ў 1812 годзе; тут адбываліся рэвалюцыйныя падзеі 1905—1907 гадоў. У нашай вобласці вядзецца вялікая краязнаўчая работа, археалагічныя даследаванні. Важную ролю тут адыгрываюць ГДУ, абласны краязнаўчы музей, Веткаўскі музей народнай творчасці разам з рэспубліканскімі навуковымі арганізацыямі. Вынікі іх работы таксама ўкараняюцца ў практыку патрыятычнага выхавання. На жаль, гэта не знайшло належнага адлюстравання ў кнізе.

Слаба адлюстравана ў манаграфіі экалагічная праблематыка, значэнне якой узрастае ў сучасных умовах. Аднак адзначаныя недахопы носяць прыватны характар і не мяняюць агульную высокую ацэнку. Кнігу неабходна рэкамендаваць усім, хто практычна заняты паўсядзённай працай ідэйнага выхавання нашай моладзі, працоўных калектываў.

**Л. ГАРАНІН,**
**кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі.**

